# ЗВЯЗДА

Родная газета на роднай мове

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ВЕРАСНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА

№ 172 (26285)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!**

Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 |


Карэспандэнт высвятляў сітуацыю

## НАВОШТА ПЕЧ У... КВАТЭРАХ?

— Калі зімой у кватэрах плюс 18, — гэта для нас вельмі добра, — канстатавалі настаўніцы школы пасёлка Копці, што ў Віцебскім раёне, з якімі пагаварыў карэспандэнт «Звязды». — А так... Прывыклі да плюс 15, часта бывае менш.

— А мой сын, каб сагрэцца, печ пабудаваў у кватэры. І добра было ягонай сям'і, пакуль не прыйшлі з праверкай ды не прыгразілі штрафам, — эмацыянальна гаворыць яшчэ адна мясцовая жыхарка. — А што рабіць, калі холадна? А мы ж у аграгарадку жывём! І адкрыўся ён афіцыйна не сёлета, а значна раней.

І насамрэч пасля размовы з ёй, калі я хадзіў па пасёлку, убачыў некалькі пячных труб на дахах. Відаць, да ўсіх уладальнікаў печаў праверка яшчэ не дабралася?

Тутэйшыя людзі яшчэ вераць у тое, што, калі адкрыюць новую кацельню, сітуацыя палепшыцца. Але гэта зацягваецца — да такіх высноў прыйшлі спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Больш за тое, па іх даных толькі леташняй зімой на цеплатрасе ў гэтым населеным пункце было 7 буйных аварый.

— Бывала, увесь дзень сядзелі без цяпла, — успамінае бабуля, — І неаднаразова такое было.

Віцебскаму аблвыканкаму пры падрыхтоўцы да чарговых ацяпляльных сезонаў 2008—2009 гадоў Урадам краіны было даручана прыняць меры па аптымізацыі цеплазабеспячэння Копцяў. Для гэтага неабходна размясціць новую кацельню на цэнтральным цеплавым пункце. Пакуль што цяпло можна падаць у жылыя дамы, школу, ФАП і г.д. са старой кацельні.

Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела арганізацыі раённай камунальнай гаспадаркі Валянцін Цімашэнка ўпэўнены, што, як і запланавана, да навагодніх святаў увядуць у эксплуатацыю новую кацельню.

— Проста нам пералічылі неабходныя грошы толькі напрыканцы жніўня. Зразумела, кантралёры проста так не абвінавачваюць. Але... Ёсць пэўныя нюансы, — гаворыць начальнік. — 7 аварый? Ну не без адключэнняў цяпла было. Цеплатрасу працягласцю ў 900 метраў, калі не памыляюся, у 1970-х праклалі. А мо і раней. Адпаведна, вялікія страты цяпла былі. Абсталяванне новае на будучай кацельні айчыннай вытворчасці. Падлічылі, што акупіцца яно менш чым праз тры гады. Старую разбураць не будзем, няхай застаецца ў рэзерве. Галоўнае, каб людзі былі ў выніку задаволены.

Безумоўна, сітуацыя ў аграгарадку з цеплазабеспячэннем няпростая. Мае суразмоўцы з тутэйшых скардзіліся, што пісалі лісты па праблеме ў розныя рэспубліканскія інстанцыі. А ці справа кіраўніцтва дзяржавы займацца такімі рэчамі? Чаму на месцы не разабраліся адказныя асобы райвыканкама, аблвыканкама? Тыя ж грошы маглі б камунальнікам пералічыць і вясной. Па даных Камітэта дзяржкантролю, 450 мільёнаў рублёў, што былі выдзелены з абласнога бюджэту, і цяпер не асвоеныя. Да новай кацельні яшчэ трэба падвесці прыродны газ. Як высветлілі кантралёры, катлы для нагрэву вады патрабуюць поўнай камплектацыі — без спецыяльных газавых прыстасаванняў працаваць не змогуць. А час ідзе...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
*Віцебскі раён.*

## Мастацтва — людзям, шалік — каханаму



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І КІТАЯ МАЕ ВЯЛІКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ»

**Гэта датычыцца ўсіх сфераў супрацоўніцтва — ад палітычнай да ваенна-тэхнічнай. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з міністрам абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі Лянам Гуанле.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што на сустрэчы ў Пекіне ў жніўні гэтага года са Старшынёй КНР абодва лідары выказалі зацікаўленасць у развіцці двухбаковых сувязяў: «Я прапанаваў кіраўніку Кітая стварыць спецыяльную групу па аналізу сітуацыі ў супрацоўніцтве Беларусі і Кітая. А самае галоўнае — выпрацаваць цэласныя прапановы па перспектывах нашага ўзаемадзеяння, каб гэтыя перспектывы былі глабальнымі і стратэгічнымі».

Супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы будзе адным з краевугольных камянёў у глабальным узаемадзеянні Беларусі і Кітая, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён канстатаваў, што абстаноўка на Захадзе не зусім спрыяльная ў ваенна-палітычных адносінах: «Нас вельмі насцярожвае пашырэнне НАТА на Усход і размяшчэнне элементаў проціракетнай абароны ЗША каля граніц Беларусі, іншыя ваенныя тэндэнцыі, звязаныя з Захадам. Таму мы ўдзяляем значную ўвагу павышэнню абараназдольнасці Беларусі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што для ўдасканалення сваёй абароны Беларусь мае дастаткова высокі ўзровень ваенна-прамысловага комплексу па асобных напрамках. «І, вядома, мы хацелі б скарыстацца супрацоўніцтвам з Кітаем, каб павысіць гэты ўзровень. Хацелася б, каб цяперашні візіт адпавядаў гэтаму высокаму ўзроўню, і каб сапраўды ў выніку яго мы змаглі рушыць наперад у нашым супрацоўніцтве», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, звяртаючыся да міністра абароны Кітая.

Аляксандр Лукашэнка закрануў і алімпійскую тэматыку: «Кітай бліскуча правёў Алімпіяду. Калі мяне спыталі пра стаўленне да Гульняў, я сказаў, што Кітай ужо выйграў іх цудоўнай цырымоніяй адкрыцця, і па выніках Гульняў кітайскія спартсмены атрымаюць перамогу. Так яно і адбылося. Віншую вас з гэтай выдатнай перамогай».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі з вялікай павагай ставяцца да поспехаў Кітая. Беларусь ганарыцца, што мае блізкія адносіны з такой гіганцкай і паспяховай краінай, якой з'яўляецца Кітайская Народная Рэспубліка, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Лян Гуанле ў сваю чаргу адзначыў, што кітайская дэлегацыя прыбыла ў Мінск па запрашэнні міністра абароны Беларусі з мэтай садзейнічаць развіццю ўзаемаразумення паміж дзяржавамі, умацаванню двухбаковага супрацоўніцтва, дружбы, а таксама каб надаць новы імпульс ваенна-тэхнічным сувязям паміж дзвюма краінамі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Маючы адбыцца візіт прэзідэнта ПАР у Беларусь паслужыць імпульсам для паглыблення адносінаў дзвюх краін

**Беларусь спадзяецца на развіццё больш глыбокіх разнапланавых кантактаў з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў ПАР Нкасазанай Дламіні-Зума.**

«Мы вельмі разлічваем, што маючы адбыцца ў 2009 годзе візіт у нашу краіну прэзідэнта ПАР Таба Мбекі паслужыць добрым імпульсам для паглыблення двухбаковых адносінаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што акрамя эканамічных перспектыў у дзвюх дзяржаў ёсць добрыя палітычныя кантакты. Абедзве краіны з'яўляюцца актыўнымі членамі Руху недалучэння. «Упэўнены, што нашы краіны павінны адыграць вялікую ролю ва ўзмацненні гэтай арганізацыі, асабліва на фоне выклікаў сучаснага свету», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу Нкасазана Дламіні-Зума паведаміла Аляксандру Лукашэнку, што Прэзідэнт Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі даручыў Міністэрству замежных спраў і дыппрадстаўніцтву гэтай краіны зрабіць усё магчымае для ўмацавання сувязяў паміж ПАР і Беларуссю.

«Мы назіраем у дзелавых колах ПАР рост цікавасці да супрацоўніцтва з беларускім бокам», — канстатавала Нкасазана Дламіні-Зума.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Выбары-2008

## СКАРГІ РАЗГЛЕДЖАНЫ

**Апошнія спробы аспрэчыць рашэнне Цэнтрвыбаркама аб адмове ў рэгістрацыі скончыліся няўдачай**

Вярхоўны Суд учора завяршыў разгляд скаргаў тых, каму было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты. Рэзюмэ такое: пададзена 19 скаргаў, адну з іх забраў заяўнік, а яшчэ па адной было адмоўлена ва ўзбуджэнні справы з-за таго, што прапушчаны тэрмін абскарджання. Такім чынам, з вынясеннем рашэння разгледжана 17 скаргаў. Дзве з іх (аб чым мы пісалі раней) задаволены, у астатніх выпадках Вярхоўны Суд падзяліў пазіцыю Цэнтрвыбаркама і не знайшоў падстаў для рэгістрацыі заяўнікаў кандыдатамі ў дэпутаты. А колькі спробаў аспрэчыць рашэнні ЦВК у Вярхоўным Судзе рабілася на мінулых выбарах? Як паведамілі нам у арганізацыйна-прававым аддзеле Цэнтральнай камісіі, у 2004 годзе было пададзена 60 скаргаў на адмову ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты. Атрымліваецца, што нязгодных з рашэннем Цэнтрвыбаркама на гэтых парламенцкіх выбарах прыблізна ў тры разы менш.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## АГІТАЦЫЯ НАБІРАЕ АБАРОТЫ

*У краіне наладжваецца камунікацыя «кандыдат — выбаршчык»*

**Передвыбарная кампанія ў Беларусі цяпер на той стадыі, калі прэтэндэнты на месцы ў парламенце маюць усе шанцы і сябе паказаць, і на выбаршчыкаў паглядзець. Наколькі актыўна сушукальнікі карыстаюцца прадастаўленымі ім магчымасцямі?**

— Агітацыйная кампанія набірае абароты, — падкрэсліў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік. — У газетах з'яўляюцца перадвыбарныя праграмы кандыдатаў. Задзейнічаны не толькі рэспубліканскія, але і абласныя, і раённыя выданні. Праходзяць сустрэчы з выбаршчыкамі. Зразумела, кожнаму кандыдату, які хоча ведаць, аб чым думаюць, чаго хочуць яго выбаршчыкі, і дзейнічаць, зыходзячы з іх патрэбаў, варта сустракацца з жыхарамі сваёй акругі.

Нагадаем, што акрамя пералічаных формаў прапаганды, кожны кандыдат можа знаёміць электарат са сваёй канцэпцыяй і выступаючы па тэлебачанні і радыё. Эфірны час ім прадастаўлены ў абласных тэлерадыёкампаніях, на каналах «СТБ», «Лад», радыёстанцыі «Сталіца». Акрамя таго, за бюджэтныя сродкі можна падрыхтаваць друкаваную агітпрадукцыю.

— Многія кандыдаты ў дэпутаты ўжо скарысталіся магчымасцю вырабіць перадвыбарныя лістоўкі і плакаты, — адзначае Мікалай Лазавік. — У некаторых гарадах такая прадукцыя ўжо з'явілася на спецыяльных стэндах. 50 базавых велічынь (1,75 млн рублёў) — дастатковая сума для таго, каб адрасаваць лістоўкі кожнай сям'і ў сваёй акрузе. Ну а калі заказваць больш яркую і каляровую прадукцыю, то відавочна, яе тыраж будзе меншым.

Агітацыя ў краіне працягнецца да 27 верасня, за выключэннем выступленняў у эфіры. Яны завершацца з пачаткам датэрміновага галасавання 23 верасня.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Выгадна банкам, у выйгрышы і кліенты...

*З наступнага года УСЕ атрымальнікі крэдытаў трапяць у гісторыю. Крэдытную*

**Ужо з 1 студзеня 2009 года ў краіне на ўсіх крэдытаатрымальнікаў, незалежна ад памеру выдадзеных банкам ім грошай, будуць фарміравацца крэдытныя гісторыі, паведаміў у гутарцы карэспандэнту «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду Нацыянальнага банка Сяргей ДУБКОЎ.**

Каментуючы рашэнне галоўнага банка краіны, Сяргей Дубкоў патлумачыў, што сёння крэдытныя гісторыі фарміруюцца толькі ў дачыненні да тых кліентаў, якія атрымалі ў банку крэдыт у памеры больш за 10 тысяч долараў ЗША. Паводле інфармацыі на 1 ліпеня гэтага года, у сістэме «Крэдытнае бюро» захоўвалася 168 816 такіх гісторый, у склад якіх уваходзяць звесткі аб 433 206 крэдытных дагаворах. Што ж датычыцца астатніх асобаў, якія, умоўна кажучы, могуць увогуле напазычаць у фінансавых установах грошай і на большую суму, але пры гэтым аформіць некалькі крэдытаў, толькі ў меншых памерах (напрыклад, энную колькасць па 5 тысяч долараў, альбо па тысячы), то яны пакуль не трапляюць у аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму «Крэдытнае бюро» Нацыянальнага банка. Не абавязкова, зразумела, што сярод апошніх могуць патрапіцца і нядобрасумленныя кліенты, але, як заўважыў банкаўскі спецыяліст, той, хто інфармаваны (у дадзеным выпадку банк), той узброены. Летась, дарэчы, за махінацыі з крэдытамі было ўзбуджана каля 80 крымінальных спраў. Трэба меркаваць, што з уступленнем у сілу пастановы павысіцца і зацікаўленасць усіх кліентаў у належным выкананні абавязацельстваў перад фінансавымі ўстановамі.

Як прадугледжваецца дакументам, з наступнага года з крэдытных гісторый будуць выключаны звесткі, якія не маюць дачынення да крэдытных дагавораў, а таксама ў дачыненні да якіх банкі не могуць забяспечыць дакладнасць. А вось тэрмін прадстаўлення банкамі звестак, якія ўносяцца ў крэдытную гісторыю, у сістэму «Крэдытнае бюро» скарочаны да дзесяці дзён (цяпер яны прадстаўляюцца банкамі на працягу першых дванаццаці дзён месяца за папярэдні месяц). Як падкрэсліў Сяргей Дубкоў, уключэнне ў крэдытныя гісторыі звестак аб выкананні ўсіх крэдытных дагавораў, а таксама скарачэнне тэрмінаў іх прадстаўлення дасць банкам магчымасць больш эфектыўна кіраваць сваімі рызыкамі.

Не застаюцца, трэба спадзявацца, у дадзеным выпадку ў пройгрышы і кліенты банкаў. «Людзям вельмі выгадна, калі ў іх ёсць добрая крэдытная гісторыя: такія кліенты могуць разлічваць на спрашчэнне працэдур па афармленні выдачы крэдыту», — гаворыць начальнік галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду Нацбанка.

Чакаецца, што неабходнасць прадстаўлення ў галоўны банк звестак аб усіх крэдытных дагаворах значна павялічыць аб'ём інфармацыі, што перадаецца банкамі, — прыкладна ў 20 разоў.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## А на агародзе закапаныя яшчэ 17 шкур дзіка...

У вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна на прыватным падворку непрацуючага грамадзяніна ў хляве былі знойдзены рогі і мяса лася. А на агародзе былі закапаныя яшчэ 17 шкур дзіка і па шкуры ласі і казулі. Гаспадар прызнаўся, што ўдзельнічаў у незаконных паляваннях. У яго былі канфіскаваны паляўнічыя ружжы «Алень» з аптычным прыцэлам і ТОЗ-63, а таксама дзяржпасведчанне на права палявання. Падчас разбору таксама быў устаноўлены ўдзел у незаконных паляваннях яшчэ аднаго грамадзяніна. У апошняга таксама канфіскаваны два паляўнічыя ружжы і дзяржпасведчанне...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХОЛАД І НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

**У пятніцу і выхадныя Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам халоднага арктычнага паветра, паведамілі рэдакцыі спецыялісты службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра.**

Будзе даволі воблачна, месцамі пройдуць дажджы. Сапраўды моцныя дажджы чакаюцца ў суботу. Тэмпература паветра ў суботу і нядзелю ўначы 1—7 цяпла, месцамі на глебе замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў, удзень толькі 5—12 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, даволі халоднае і воблачнае надвор'е захаваецца ў краіне і ў першай палове наступнага тыдня. Чакаецца, што тэмпература паветра ўначы будзе ў межах 3—8 градусаў, месцамі невялікія замаразкі, удзень — 7—13 цяпла. Сіноптыкі разлічваюць, што істотна пацяплее толькі бліжэй да наступных выхадных.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ФАЛЬШЫВЫ «ЗАКАЗ»

**У Мінску правахоўнікі затрымалі «кілера», які, за права на жыццё, патрабаваў у жанчыны, якую яму нібыта заказалі забіць, 15 тысяч еўра.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, 22-гадовы прайдзісвет патэлефанаваў 32-гадовай жанчыне і паведаміў, што павінен за грошы з ёй расправіцца. Аднак прапанаваў перакупіць «заказ» сваёй патэнцыйнай ахвяры: маўляў, за вышэйзгаданую суму гатовы перагледзець «кантракт» не на карысць яе ворага. Махляра затрымалі пасля таго, як ён атрымаў ад жанчыны на вуліцы Працоўнай частку «адкупных» — 10 тысяч долараў ЗША.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## 3500 ВУЧНЯЎ ЭВАКУЯВАЛІ З ГІМНАЗІЙ...

**У Мінску пасля тэлефоннага званка без чвэрці восем раніцы на спецлінію «102» невядомага давялося тэрмінова выводзіць з будынкаў трох навучальных устаноў 3500 вучняў і выкладчыкаў.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, «дабрадзей», сігнал ад якога паступіў з таксафона, размешчанага па праспекце Незалежнасці, папярэдзіў праваахоўнікаў пра тое, што сталічныя гімназіі №№ 6, 7 і 8 замініраваныя. Супрацоўнікі Савецкага і Партызанскага РУУС, групы размініравання спецпадраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» і адной з вайсковых часцей, што працавалі на месцы здарэння, ні ў адной з устаноў «бомбаў» не знайшлі. Што ж датычыцца «жартаўніка», то яго цяпер спрабуюць адшукаць, а па факце ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## НА ДАРОЗЕ ЗАГІНУЛА НЕМАЎЛЯ

**У Брэсцкім раёне паміж вёскамі Косічы і Вялікая Курніца аўтамабіль вылецеў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з другім аўтамабілем.**

У аўто вінаўніка ДТЗ знаходзілася сям'я: бацька, маці і трое дзяцей. У выніку аварыі жанчына з цяжкімі траўмамі трапіла ў бальніцу. Малодшы сын, якому споўнілася толькі два месяцы, загінуў на месцы. Двое старэйшых дзяцей знаходзяцца на абследаванні ў абласной дзіцячай бальніцы.

**Яна СВЕТАВА.**

Бізнэс-конкурс

## ЛЕПШЫЯ ПАЖАДАННІ ДЛЯ ЛЕПШЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Сідорскі павіншаваў пераможцаў і лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2007 года» — 47 удзельнікаў у 16 намінацыях. Усяго ў чарговым прадпрымальніцкім конкурсе ўзялі ўдзел звыш 900 суб'ектаў гаспадарання краіны.**

На ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання лепшых з лепшых Сяргей Сідорскі заўважыў, што досыць эфектыўнае развіццё эканомікі краіны абумоўлена ў многім прадпрымальніцкай ініцыятывай. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на агульныя эканамічныя паказчыкі развіцця Беларусі. Так, за восем месяцаў гэтага года рост унутранага валавога прадукту склаў 10,6 працэнта да ўзроўню мінулага. Упершыню сёлета тэмпы росту прамысловай вытворчасці і прадукцыйнасці працы перавысілі тэмпы росту рэальнай заработнай платы.

Што датычыцца прадпрымальніцкіх структур, то па якасці прадукцыі і ўзроўню паслуг яны складаюць дастойную канкурэнцыю дзяржаўнаму сектару эканомікі. За першае паўгоддзе колькасць малых прадпрыемстваў у Беларусі павялічылася на 36 працэнтаў і цяпер складае 51 тысячу. Колькасць працуючых тут вырасла ў параўнанні з мінулым годам з 407 тысяч чалавек да 450. У першым паўгоддзі суб'екты малога прадпрымальніцтва вырабілі каля 9 працэнтаў усяго ўнутранага валавога прадукту.

Да канца 2010 года ўдзельная вага малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў агульным аб'ёме выручкі ад рэалізацыі тавараў і паслуг павінна быць даведзена да 30 працэнтаў. Забяспечана гэта будзе актывізацыяй дзейнасці малога бізнэсу, павелічэннем колькасці суб'ектаў, прыцягненнем інвестыцый, пашырэннем доступу да крэдытных рэсурсаў і іншымі фактарамі. Чацвёртая частка рабочых месцаў павінна засяродзіцца ў прыватным сектары.

Беларускія прадпрымальнікі адыгрываюць ключавую ролю ў галіне гандлю, грамадскага харчавання, арганізацыі розных відаў паслуг, агратурызме і недастатковую — у такіх галінах, як жыллёва-камунальная, лясная гаспадаркі, сувязь, ахова здароўя, сацыяльнае забеспячэнне, навука.

Курс на падтрымку прыватнай ініцыятывы застаецца нязменным, падкрэсліў Сяргей Сідорскі. Ён пажадаў нацыянальнаму бізнэсу больш актыўна ўцягвацца ў працэс інавацыйнага развіцця дзяржавы, паколькі менавіта прадпрымальніцкае асяроддзе заўсёды было больш успрымальным да ўсяго новага і перадавога.

Па выніках правядзення рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2007 года» за дасягненне высокіх паказчыкаў у фінансава-гаспадарчай дзейнасці ў намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці спажывецкіх тавараў» пераможцам прызнаны СТАА «ЗОЎ-ЛенЕЎРАМЭБЛЯ», г. Гродна. Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці прадуктаў харчавання — ААТ «Малочны свет», г. Гродна, у галіне вытворчасці тавараў прамысловага прызначэння — ТАА «Інтэп», г. Наваполацк, у галіне будаўнічай дзейнасці — індывідуальны прадпрымальнік Лілія Жадан, г. Капыль, у галіне аптовага і рознічнага гандлю — ТАА «Сыравінныя рэсурсы-Бел», г. Мінск, у галіне медыцынскай дзейнасці — НВПУП «АДАНІ», г. Мінск, лепшая арганізацыя з замежнымі інвестыцыямі — СТАА «ЗОУ-ПЛІТА», г. Гродна, лепшая сялянская (фермерская) гаспадарка — гаспадарка «Канстанцін» в. Карзева Дрыбінскага раёна, лепшы прадпрымальнік у галіне аказання паслуг — індывідуальны прадпрымальнік Віталь Ліхачэўскі, г. Ганцавічы, у галіне аказання фізкультурна-аздараўленчых паслуг — УП Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь «Спартыўна-аздараўленчы комплекс «Алімпійскі», г. Мінск, у галіне турызму — індывідуальны прадпрымальнік Сяргей Кучаравенка, г. Мінск, лепшы суб'ект інфраструктуры падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва — ПУП па аказанні паслуг «ЭНВЕК», г. Мінск, лепшы экспарцёр — ЗАТ «Беларуская суднаходная кампанія», г. Мінск, лепшы арганізатар новых рабочых месцаў — СЗАТ «ЛІПЛАСТ-СПб», г. Ліда, лепшы банк па аказанні паслуг прадпрымальнікам — СААТ «Белгазпрамбанк», г. Мінск. У намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне грамадскага харчавання» вызначаны толькі лаўрэаты.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Мы — не статысты ў Еўропе

У Польшчы ў горадзе Крыніца адкрыўся XVIII Эканамічны форум. У ім удзельнічае беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Андрэем Кабяковым.

У час работы форуму ён выступіў з дакладам на пленарнай сесіі па актуальнай і інтрыгуючай тэме» Еўрапейскія дылемы. Цэнтральная Еўропа: партнёр ці статыст?» Кіраўнік беларускай дэлегацыі ў рамках форуму сустрэўся з віцэ-прэм'ерам, міністрам эканомікі Польшчы Вальдэмарам Паўлякам. Былі абмеркаваны шляхі пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. А яно апошнім часам набыло станоўчую дынаміку. За 7 месяцаў 2008 года гандлёвы абарот вырас на 70 працэнтаў і дасягнуў 1773,6 млн долараў ЗША. Пры гэтым беларускі экспарт вырас на 88,4 працэнта (да 1147,3 млн долараў, а польскі — на 44,2 працэнта (626,2 млн долараў).

Як паведаміла прэс-служба беларускага пасольства ў Варшаве, таксама адбылася кароткая гутарка Андрэя Кабякова з прэм'ер—міністрам Польшчы Дональдам Тускам. Яны абмяняліся думкамі наконт цяперашняга стану двухбаковых гандлёва-эканамічных адносінаў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Аляксандраў дзень

**Сёння ў храме Аляксандра Неўскага ў Мсціславе адбудзецца прастольнае свята. Праваслаўная царква адзначае 12 верасня Дзень памяці святога князя.**

Храм пабудавалі ў другой палове XIX стагоддзя і асвяцілі ў гонар Аляксандра Неўскага. Сёння раніцай сюды імкнуцца праваслаўныя вернікі на святочнае богаслужэнне, якое вядзе епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній.

— У нашым храме знаходзіцца абраз Аляксандра Неўскага — паведаміў дабрачынны Мсціслаўскай акругі протаіерэй Аляксандр Ганчарук. — У ім ёсць частка мошчаў вялікага палкаводца. Некалькі гадоў таму я прывёз з Санкт-Пецярбурга, з Аляксандра-Неўскай лаўры, дзе пакоіцца святы князь.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.09.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 113,00 |
| 1 еўра | 2 944,57 |
| 1 латвійскі лат | 4 179,61 |
| 1 літоўскі літ | 852,77 |
| 1 чэшская крона | 119,59 |
| 1 польскі злоты | 865,35 |
| 1 расійскі рубель | 81,95 |
| 1 украінская грыўня | 440,71 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,7842 |
| 10 UAH | 53,9983 |
| 1000 BYR | 12,2084 |
| EUR | 35,9922 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 11.09.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009



ISSN 1990 - 763X



**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже производственной базы ОДО «Консул» (1993—1995 г.п.) в составе: пилорамный цех (об. пл. 354,5 кв. м), лесопильный цех с кран-балкой (об. пл. 356,2 кв.м), столярный цех (об. пл. 356,2 кв. м), административно-бытовое здание (об. пл. 211,8 кв. м), сушилка-котельная (об. пл. 192,9 кв.м), гвоздильный цех (об. пл. 742,5 кв. м), навес для хранения готовой продукции (об. пл. 832 кв. м), водонапорная башня, растворно-бетонный узел, подстанция КТП-400, ж/б забор, покрытие из аэродромных плит ПАГ-14 — расположенной по адресу: Гродненская область, Ошмянский район, д. Буденовка (54 км до г. Вильнюса).

Начальная цена с НДС — 1 416 000 000 бел. руб.

*Площадь земельного участка — 3,6 га.*

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2008 г. **Аукцион состоится 07.10.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 06.10.2008 г. до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015



**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит аукционные торги по продаже:**

**объектов недвижимости:**

- 2-этажное кирпичное здание (602 кв.м) 1987 г.п., г. Минск, ул. Фабрициуса, 8. Пл. зем. уч. — 0,1335 га. *(ОАО «Минский завод «Калибр»)*;
- 3-этажное кирпичное здание (612,5 кв.м) 1993 г.п., г. Минск, ул. Куйбышева, 19 (л. ЖЗ/К). Пл. зем. уч. — 0,0360 га. *(ОАО «Горизонт»)*;
- здание ателье № 5 (155,0 кв.м), г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Пл. зем. уч. — 0,0595 га;
- в Воложинском р-не: здание блочного склада 1252,9 кв.м, здание склада «Модуль» 878,5 кв.м (д. Городьки); здание магазина 73,8 кв.м (г. п. Ивенец).

**производственных баз** (в т.ч. здания, сооружения и др.):

- Гродненская обл., Ошмянский р-н, д. Буденовка (54 км до г. Вильнюс). Пл. зем. уч. — 3,6 га;
- корпус мастерской (429,5 кв.м), материальный цех (419,9 кв.м), административное здание (48,9 кв.м), котельный цех (7,8 кв.м), забор металлический, ворота въездные, Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Железнодорожная, 32. Пл. зем. уч. — 1,8287 га;
- СТО в составе: здание автомастерской (517 кв.м) и оборудование. Рогачевский р-н, д. Виков, ул. Лесная, д. 5А. Пл. зем. уч. — 0,0855 га.

**права заключения договоров аренды:**

- складских и административных помещений различной площади в Минском районе, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9. (3 км от МКАД).

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

12 ВЕРАСНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 36 (15540)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# МАМА НАЗАЎСЁДЫ

Мама. Аднойчы мы вымаўляем гэтае слова ўпершыню. Так мы вучымся гаварыць. Любіць. Жыць.

Ма-ма. Пявуча-цёплае. Роднае.

Але здараецца і так, што матуляй нам становіцца зусім не тая жанчына, што нас нарадзіла.

Разумныя людзі кажуць, што маці тая, хто выгадавала. І гэта несумненна так...

У скронях ціхенька пульсуе: усе мы родам з дзяцінства. А якое яно, наша дзяцінства? Для кагосьці — шчаслівае, бесклапотнае. А хтосьці, можа, хоча хутчэй яго забыць.

Насамрэч цяжка ўявіць сабе, якім было дзяцінства Алены Міхайлаўны Піскун. Яна вырасла чалавекам з такім вялікім сэрцам, што ў ім хапае месца для ўсіх, каму патрэбныя любоў і клопат. Як шмат у ім непатрачанай мацярынскай цеплыні!

У сям'і Алены Міхайлаўны і Васіля Аляксандравіча Піскуноў чацвёра дзяцей. Дзіна і Валера — свае і двое прыёмных. Па дакументах. А ў жыцці яны ўсе свае — адна вялікая сям'я.

Аднолькава дарагія садраныя каленкі і першыя адзнакі, перажыванні як сваіх, так і прыёмных дзяцей — Машы і Волечкі Белабровік.

— Мы з мужам даўно хацелі ўзяць маленькую дзяўчынку. Доўга абмяркоўвалі гэта ў сямейным коле. Сын вельмі разважна гаварыў, што дзеці — гэта не цацка, што нам будзе цяжка. Але мы вырашылі. Аб чым не шкадуем... Адразу ж паехалі ў дзіцячы дом і першымі нам паказалі дзвюх сясцёр — Машу і Волю. Забралі абедзвюх. Не хацелі разлучаць.

Дзяўчаткі асвоіліся хутка. Праз дзве гадзіны ўжо адчувалі сябе як дома. Толькі ці былі ў іх дом? Волечка і Маша трапілі ў прытулак пасля таго, як памёр ад гарэлкі іх бацька, а маці пазбавілі бацькоўскіх правоў.

**— Калі дзяўчаты сталі зваць вас мамай?**

— Хутка. Прайшоў месяц-паўтара, і мы задумаліся даць ім сваё прозвішча. Але параіліся ўсёй сям'ёй і вырашылі, што пры паступленні дзеці страцяць ільготы. Цяпер у іх сваё прозвішча — Белабровік. Але ж ці гэта важна? Яны ж усё роўна свае, родныя.

У маёй роднай сястры чацвёра малых дзяцей. Вось мае дзяўчаткі збегаюць да іх, пагуляюць і тады пачынаецца: «Мама, ну вазьмі нам яшчэ сястрычку!» А я вось і думаю — трэба ўзяць. Дзе двое, там і трое, і чацвёра. Выгадуем! — упэўнена і весела гаворыць Алена Міхайлаўна.

**— Ці ёсць у дзяўчынак якія-небудзь таленты? Чым яны любяць займацца?**

— О! Яны ў мяне рукадзельніцы. Вольга вельмі прыгожа вышывае, яе вырабы — у СДК на выставе, а Машка з бісеру робіць усялякія мілыя штучкі. Вось глядзіце, у мяне тут невялікая выстава іх работ! — І з гонарам дадае: — Ну вы толькі паглядзіце! Я сама такое ніколі б не зрабіла! Яны і вучацца добра. Машы пакуль адзнакі не ставяць, а Волі 9 і 10 прыносіць.

Я гляджу на палічкі, на якіх утульна размясціліся дзіцячыя вырабы, па праўдзе захапляюся шэдэўрам 8-гадовай Машы — кветачкай з бісеру — і думаю аб тым, чаму простыя беларускія людзі з сярэднім дастаткам узялі ў сваю сям'ю двух маленькіх чалавечкаў?

Дзве душы вучацца жыць у гэтым свеце, які так бязлітасна і груба іх пакрыўдзіў. Толькі вось зараз яны вучацца гэтаму не адны. Ім дапамагае ІХ СЯМ'Я.

І я задаю сваё наступнае, напэўна, самае цяжкае для мяне пытанне, гэтай цудоўнай жанчыне, што сядзіць каля мяне і чамусьці хвалюецца, церабіць альбом з фотаздымкамі.

**— У вас не ўзнікала жадання, калі было цяжка, вярнуць іх назад?**

— Не. Ніколі. Калі мне цяжка, я заўсёды думаю,што ім калісьці было яшчэ складаней.

Я не ведаю, што з іх атрымаецца. Ад лёсу не збяжыш. Але калі што ўчынілі, дык размаўляем як з дарослымі. З Вольгай у гэтым плане, безумоўна, складаней. Яна ж вялікая ўжо. Ды і нацярпелася многага. Яна Машку сама гадавала. Ёй тады было шэсць. І ежу гатавала сама, і адзежу мыла.

Зіма, холад. А дроў няма. Яна ідзе і шукае якое палена, каб растапіць. Ці ўвогуле ідзе маці п'яную ў хату зацягваць...

І я веру, што Алена Міхайлаўна выхавае іх такімі ж добрымі, як разумніца Дзіна, якая вучыцца ў БДМУ на педыятра (усё ж такі дабрыня перадаецца па спадчыне), такімі ж, як самастойны, справядлівы студэнт БРУ Валера, які з дзяцінства марыць стаць міліцыянерам. І я дакладна ведаю — абавязкова стане!

Алена Міхайлаўна паказвае мне раннія фотаздымкі дзяцей. Вось яны стаяць усе разам — крыху сарамлівы, насцярожаны позірк, кароткія хлапечыя стрыжкі, старанна надзетыя на іх новай мамай адпрасаваныя сукенкі, заціснутыя ў кулачках гваздзічкі.

Прайшло тры гады.

Сёння Вольга шумна бяжыць да тэлефона і весела крычыць: «Алё!», а Маша выходзіць з пакоя насупраць з вялізнымі прыгожымі бантамі на доўгіх каштанавых валасах...

Дзеці растуць, з'язджаюць з роднага дома, але цеплыня, якую змагла падарыць нам сям'я, застаецца і захоўвае нас вечна.

Поспехаў вам. І беражыце адзін аднаго!

**Ірына РАМАНІВА.**

# ПАД ДВАЙНЫМ ДОГЛЯДАМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАМЯНЕЦКІ РАЁН.

## СТУДЭНТ, ЯКІ КАМФОРТНА ЖЫВЕ, ЛЕПЕЙ ВУЧЫЦЦА

**У гэтым перакананыя студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: 1 верасня ў Горках адкрыўся новы інтэрнат.**

Стары будынак, узведзены яшчэ ў 1932 годзе, поўнасцю рэканструявалі за два гады. На гэта выдаткавана больш за 5 мільярдаў рублёў.

— Інтэрнат стаў іншым, — расказаў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце Аляксандр Чачоткін. — Калі я быў студэнтам, я жыў у ім: тады ў пакоі было 8 чалавек. Цяпер там зроблены блокі: кухня, прыбіральня і пакоі на 2—3 чалавекі.

За мінулым часам у інтэрнаце жылі 800 чалавек, а цяпер — толькі 360. Затое ў камфортных умовах. Кіраўніцтва акадэміі разлічвае, што добрыя ўмовы жыцця станоўча адаб'юцца на вучобе.

Хоць БДСГА мае патрэбу ў жыллі: у 12 інтэрнатах акадэміі не хапіла месца 860 студэнтам. Дэфіцыт утварыўся ў сувязі з павелічэннем колькасці студэнтаў і, больш за ўсё, замежнікаў, якія навучаюцца ў акадэміі: сёлета ў Горкі прыехалі 200 студэнтаў з Туркменістана, па дзясятку — з Кітая і Індыі.

Каб забяспечыць усіх студэнтаў інтэрнатам, у Горацкім студгарадку мяркуецца пабудаваць новы шматпавярховы камфартабельны інтэрнат, які здыме ўсе праблемы з жыллём. Будаўніцтва спадзяюцца пачаць у наступным годзе.

**Ілона ІВАНОВА.**

# СТУДЭНТЫ МІЖНАРОДНАГА МАШТАБУ

**Пустыя кішэні і кашалёк — здаецца, гэтая з'ява звыклая для студэнтаў. Але не ўсё так безнадзейна. Зберагчы каштоўныя рублі нашаму брату пры жаданні няцяжка. Гарантаваныя скідкі і льготы ў свеце, у тым ліку і ў Беларусі, сёння існуюць для сарака мільёнаў студэнтаў, якія маюць міжнародны студэнцкі білет.**



International Student Identification Card (ISIC) — гэта адзіны міжнародны студэнцкі білет, які пацвярджае студэнцкі статус у свеце і забяспечвае шматлікія гарантыі за мяжой і ў роднай краіне. Ідэя аб стварэнні падобнага дакумента нарадзілася яшчэ ў канцы 40-х гадоў XX стагоддзя. Менавіта ў 1949 годзе пры падтрымцы ЮНЕСКА была створана Міжнародная канфедэрацыя студэнцкага турызму. Для студэнтаў яна павінна была стаць сапраўднай палачкай-выручалачкай у пытаннях падарожжа за мяжу, навучанні па абмене, атрыманні новых ведаў пра народныя культуры свету. Каб зрабіць дыялог паміж моладдзю розных краін больш простым, у 1968 годзе Міжнародная канфедэрацыя студэнцкага турызму стварыла Асацыяцыю міжнароднай студэнцкай карткі. Тады ж убачыла свет першая картка — першы міжнародны студэнцкі білет (ISIC).

ISIC прызнаецца ў Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Нарвегіі, Даніі, Швецыі, Фінляндыі і яшчэ амаль у ста краінах свету. Ён забяспечвае права студэнтаў на шматлікія скідкі, ільготы і ў першую чаргу за мяжой. Кожная ўстанова, якая мае дагавор з Асацыяцыяй міжнароднай студэнцкай карткі, вызначае свае памеры скідак на авіябілеты, праезды на міжгародніх аўтобусах, страхавыя полісы, пакупкі ў магазінах, медыцынскую дапамогу, наведванне музеяў, выстаў, начных клубаў, спартыўных комплексаў, пражыванне ў гасцініцах і не толькі. Напрыклад, у Чэхіі міжнародны студэнцкі білет дае права на 50-працэнтныя скідкі на наведванне піцэрый, кафэ, дыскатэк, на праезд у транспарце, пражыванне ў гасцініцах.

ISIC — выдатная магчымасць зэканоміць і ў Беларусі. Так, у Мінску існуе каля сотні ўстаноў, якія прызнаюць міжнародны студэнцкі білет і прапануюць немалыя льготы. Некаторыя стаматалагічныя клінікі дораць наведвальнікам 11 працэнтаў ад кошту стаматалагічных паслуг. А Нацыянальны музей гісторыі і культуры ўвогуле гарантуе ўладальнікам міжнароднага студэнцкага білета бясплатнае наведванне. Фотапаслугі, салоны прыгажосці, хімчысткі — скідкі на гэтыя паслугі дапамогуць студэнту зберагчы не адзін рубель.

Для студэнтаў, якія любяць вандроўкі, незаменнымі з'яўляюцца паслугі міжнароднай ільготнай сеткі камунікацый ISIConnect. Уладальнікі міжнароднага студэнцкага білета, якія звяртаюцца да паслуг гэтай сеткі, маюць 70 працэнтаў скідак на міжнародныя тэлефонныя перагаворы, і магчымасць карыстацца бясплатнай электроннай поштай. А вырашыць медыцынскія, юрыдычныя і іншыя праблемы за мяжой і ў нашай краіне дапаможа Міжнародная кругласутачная лінія экстрэмальнай дапамогі (+44) 20 8666 9205.

Атрымаць міжнародны студэнцкі білет проста, калі вы студэнт і вам не больш чым 35 гадоў. У Беларусі гэтым пытаннем займаецца Цэнтр маладзёжных вандровак, які знаходзіцца ў Мінску па вуліцы Варвашэні, 17 — 101. З сабой неабходна мець фотаздымак 3х4, студэнцкі білет і пашпарт. Праз некаторы час вы атрымаеце пластыкавую картку, на якой нанесены прозвішча і імя студэнта, дата нараджэння, асабісты подпіс, індывідуальны нумар, перыяд дзеяння білета і фотаздымак. Міжнародны студэнцкі білет у вашых руках!

Калі вы не студэнт, не ўсё згублена. Асацыяцыя міжнароднай студэнцкай карткі паклапацілася пра выкладчыкаў і моладзь, якая не вучыцца ў ВНУ. ITIC — міжнародная картка выкладчыка і IYTC — міжнародная маладзёжная картка пачалі дзейнічаць пазней. Прызнаюцца яны ў меншай колькасці краін і маюць бяднейшы спектр скідак, чым ISIC, але гарантуюць дастаткова магчымасцяў зэканоміць.

Новы навучальны год наступіў. Для кагосьці студэнцкае жыццё працягваецца, а хтосьці ўпершыню пераступіў парог ВНУ. Магчыма, менавіта міжнародны студэнцкі білет дапаможа вам разбурыць міф аб спрадвечна галодным і бедным студэнце.

**Поўны спіс прапануемых скідак у Беларусі можна знайсці па адрасе ў інтэрнэце http://www.ytc.by/discount/index.php**

**Жанна БАЙГОТ,**
**студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы.**

# БІБЛІЯТЭЧНЫЯ «ВАРОТЫ» — СУПРАЦЬ КРАДЗЯЖУ

**12 верасня на факультэце журналістыкі і факультэце філасофіі і сацыяльных навук (ФФСН) БДУ святочны дзень. Нарэшце, пачынае працаваць чытальная зала бібліятэкі.**

